уключаецца ў кантэкст беларускай літаратуры: паэт стварыў па-беларуску яркія мастацкія эквіваленты, пераўвасабленні, яскравыя паэтычныя формы. У гэтым плане ён – прадаўжальнік творчых ідэй і традыцый Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, звязаных з эстэтычным узвышэннем і ўзбагачэннем беларускай нацыянальнай літаратуры.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Гілевіч Н.* Актавы. Мінск: Маст. літ., 1976. 142 с.
2. *Гілевіч Н.* Выбраныя творы / уклад., камент. Н. Гілевіча; прадм. У. Конана. Мінск : Кнігазбор, 2009. 350 *с.*
3. *Гілевіч Н. З*бор твораў : у 23 т. Мінск : Кніга, 2003. Т. 1. 416 с.
4. *Гілевіч Н.* На флейце самоты: лірычныя мініяцюры ў жанры «танка». Мінск : Про Хрысто, 2004. 92 с.
5. *Рагойша В.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд., дапрац. і дапоўн. Мінск : Беларус. навука, 2004. 576 с.
6. *Сіненка Г. Д.* Ніл Гілевіч : нарыс творчасці. Мінск : Вышэйш. шк., 1981. 269 с.

# ЦІШКА ГАРТНЫ – ПАЧЫНАЛЬНІК УРБАНІСТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ

***А. І. Бельскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*a_belsky@tut.by*

Упершыню вершы Цішкі Гартнага пра горад разглядаюцца як адзінае тэматычнае цэлае і ў кантэксце станаўлення беларускай урбаністычнай паэзіі. Паэт па-свойму адметна ўвасобіў вобразны свет роднага мястэчка, прастору вялікага горада. Аб’ектам паэтычнага сузірання сталі не толькі рэаліі беларускага горада, але і локусы, рэчаіснасць Берліна. Цішка Гартны стварыў яскравыя ўрбаністычныя замалёўкі, пры гэтым перадаў свае ўражанні і настроі. Асобныя гарадскія тэксты паэта маюць імпрэсіяністычныя рысы, прыкметы містычнага сімвалізму. Урбанізм як адметны тып мыслення пашыраў вобразна-тэматычныя і выяўленча-стылёвыя абсягі беларускай паэзіі 1920-х гадоў.

***Ключавыя словы:*** урбаністычная паэзія; гарадская тэма; урбанізм; урбаністычны пейзаж; вобразная структура; паэтычныя ўражанні.

У першай трэці ХХ ст. надзвычай хутка і прыкметна адбывалася станаўленне жанравай сістэмы беларускай паэзіі, пачаў пашырацца яе тэматычны і вобразны склад, запачаткоўваліся новыя плыні і кірункі. Адным з самых значных і яскравых паэтаў-наватараў стаў Максім Багдановіч, які, апрача іншага, з’яўляецца агульнапрызнаным пачынальнікам урбаністычнай паэзіі. Праўда, наспела патрэба змясціць акцэнты ў літаратуразнаўчым дыскурсе датычна гарадской тэмы ў айчыннай паэзіі, на што мы звярталі ўвагу ў ранейшых публікацыях [2]. Гістарычная і тагачасная Вільня знайшла ўвасабленне ў творах Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Ануфры Петрашкевіча і некаторых іншых паэтаў ХІХ ст. Асабліва

яскрава рысы ўрбаністычнага мыслення выявіліся ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. І ўсё ж менавіта пачатак XX ст. з яго імклівым ростам гарадоў, іх эканамічным і культурным развіццём стаў часам нараджэння паэтычнага ўрбанізму як літаратурна-эстэтычнай з'явы.

Зрэшты, урбаністычная тэма ў беларускай паэзіі ў асноўным разглядалася на матэрыяле твораў пачатку XX ст. (пачынаючы ад нашаніўскага крытыка Антона Луцкевіча і да нашага сучасніка Сяргея Дубаўца). Гарадскі дыскурс актуалізаваўся ў літаратуразнаўстве і крытыцы найноўшага часу, пра што засведчылі артыкулы Н. Пыско «Урбаністычныя матывы ў творах Янкі Купалы і Максіма Багдановіча» (2002), с. Грымуты «Горад у паэтычным адлюстраванні Максіма Багдановіча (параўнальны аспект)» (2009), Т. Ганчаровай-Цынкевіч «Вобраз Вільні ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя» (2009), М. Весялухі «Урбаністычныя матывы ў паэзіі Максіма Танка 1930-х гг.», «Паэзія Уладзіміра Жылкі ў кантэксце ўрбаністычнай традыцыі» (абодва – 2010), А. Багушэвіча «Паэтыка верша Янкі Купалы “На вуліцы” (да праблемы станаўлення ўрбаністычнай традыцыі ў беларускай паэзіі)» (2013) і інш. Аўтары гэтых публікацый – маладыя даследчыкі, прадстаўнікі новай філалагічнай генерацыі. Самымі свежымі, апошнімі па часе прыкладамі ўзмацнення навуковай цікавасці да ўрбаністычнай паэзіі могуць паслужыць артыкулы **В. Жыбуля, надрукаваныя ў часопісе** «Роднае слова»**:** «“Табе, мой Мінск, хвалу пяю…”: мінскія рэаліі ў паэзіі Петруся Броўкі» (2020, № 5), «“Як жыццё – шырокі, і як песня – звонкі…”: Мінск у творчасці Пятра Глебкі» (2020, № 6). Між тым айчынныя тэарэтыкі, складальнікі слоўнікаў літаратурных тэрмінаў і паняццяў не заўсёды паспяваюць фіксаваць новыя факты і з'явы, якія ўрэчаісніліся, зацвердзіліся ў эстэтычнай прасторы. Так, В. Рагойша ў сваім «Паэтычным слоўніку» адзначае, што «з пачатку XX ст. у беларускай літаратуры пашыраецца ўрбаністычная паэзія…» [8, с. 496], называе цыкл «Места» М. Багдановіча, імёны іншых паэтаў, у тым ліку сучасных. Аднак ён не вылучае як асобную катэгорыю «Урбанізм», адсутнічае характарыстыка ўрбаністычнай лірыкі як асобнай жанрава-тэматычнай разнавіднасці паэзіі, не знаходзім у «Прадметным паказальніку» адсылкі да паняцця «ўрбаністычны пейзаж». Зразумела, гэта пытанне часу – і, будзем спадзявацца, кола літаратурных катэгорый і тэрмінаў у даведачных выданнях па тэорыі літаратуры пашырыцца. А што мы ў гэтым плане спазняемся – факт. Скажам, тэрмін «урбанізм» улучаны ў адзінаццацітомную «Литературную энциклопедию», выдадзеную яшчэ ў 1939 г., дзе гэта паняцце тлумачыцца як «адлюстраванне ў літаратуры (у яе тэматыцы, вобразах, стылі) вялікага горада з высокаразвітай тэхнікай і індустрыяй, гарадскога быту, асаблівасцей псіхікі, спароджаных гарадскім укладам» [7, стлб. 606]. У «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (1987, т. 5) тэрмін «урбанізм» разглядаецца выключна як «кірунак у архітэктуры і горадабудаўніцтве 20 ст.» [10, с. 364]. У дачыненні да

літаратуры і мастацтва, на жаль, ён не выкарыстоўваецца. Зрэшты, цікава, што ў шэрагу даведачных выданняў савецкага часу паняцце «ўрбаністычная паэзія» набывае трактоўку з ідэалагічных пазіцый: «**УРБАНІСТЫЧНАЯ ПАЭЗІЯ** (ад лац. *urbanus* – гарадскі) – паэзія, у якой адлюстроўваецца жыццё буйных капіталістычных гарадоў з іх вялікім насельніцтвам, шумнай тэхнікай, з кантрастамі раскошы і беднасці» [9, с. 428]. Гэта азначэнне шырока растыражавана ў сучаснай інтэрнэт-прасторы.

Апрача М. Багдановіча, станаўленне і развіццё ўрбаністычнай тэмы ў беларускай паэзіі 1910–1930-х гг. справядліва звязваецца з імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Уладзіміра Жылкі, Андрэя Александровіча, Алеся Дудара, Янкі Бобрыка, Максіма Танка, Юлія Таўбіна і інш. У пераліку пачынальнікаў паэтычнага ўрбанізму Цішка Гартны калі і згадваецца, то рэдка ці мімаходзь, не кажучы пра тое, што ўрбаністычны дыскурс у яго лірыцы не быў прадметам асобнага разгляду. На тэму горада ў паэзіі Цішкі Гартнага звяртаў увагу даследчык яго творчасці С. Александровіч, сярод іншых вершаў ён вылучаў цыкл «Горад» і, у прыватнасці, пісаў: «Урбаністычныя матывы, гарадскія малюнкі арганічна суседзяць з непаўторнымі краявідамі роднай Капыльшчыны і Случчыны» [1, с. 13–14].

Цішка Гартны нарадзіўся ў Капылі, дзе ён гадаваўся і сталеў. У тую пару, калі тут паэт жыў, гэта было тыповае беларускае мястэчка ці невялікі горад, які меў рысы вясковага паселішча з яго адмысловым узгорыстым ландшафтам. Праўда, у часы ВКЛ і раней Капыль лічыўся княжацкім замкам з так званым местам – гэта значыць, горадам. Яго жыхарамі былі пераважна рамеснікі і гандляры, частка насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. Былі і заможныя месцічы-мяшчане, купцы, шляхта. У 1652 г. Капыль атрымаў Магдэбургскае права. Цішка Гартны стаў першым паэтычным адкрывальнікам свету свайго мястэчка. На пачатку верша «Капыль», які датуецца 1914 г., ён стварае пейзажны вобраз радзімы, паэтызуе добра знаёмыя з маленства краявіды, улучае рэцыпіента ў ландшафтную прастору: «Капыль, Капыль! Маё мястэчка, // Вялікай Міншчыны куток! // Мне міла ўсё тваё: і рэчка, // І хаты, нівы і гаёк… // Вакол яго снуе далінай // Шнурок вясёлы раўчука, // Якога нам, бы матка сына, // Спакон вякоў дала рака…» [5, с. 70–71]. А далей Цішка Гартны апавядае пра Капыль як месца спрадвечнае, гістарычнае. Мінуўшчына ў трактоўцы паэта паўстае як час гераічны, легендарны, даўнія падзеі ўспрымаюцца ім праз прызму барацьбы і змагання за родны край: «На нівах густа разлягліся // Астаткі шведскае вайны, // Што ў час вяковы не звяліся // Ў траве зялёнай курганы. // Пад іх грамадаю маўклiва // Ваякаў слаўных косці спяць, // Пайшоўшых смела ў час прызыву // Свой родны край абараняць. // Між тых курганаў, на адгону, // Высокі замак з цьмі вякоў // Ўстае, як сведка ўлады і закону // Старых часоў, сваіх князёў» [5, с. 71]. Як можна пераканацца, прыродна-ландшафтная прастора атрымлівае гістарычнае вымярэнне і адлюстраванне,

паэт запыняецца на слядах і знаках гераічнага мінулага. Цішка Гартны звяртаецца да старажытнай гісторыі Капыля, каб падкрэсліць яго значнасць у лёсе і гісторыі бацькаўшчыны. Локус горада паўплываў на фарміраванне кантэксту духоўнага быцця паэта, які, абмалёўваючы і дэталізуючы навакольны пейзажны свет, раскрывае, можна сказаць, «ландшафт душы». Затым гістарычны экскурс змяняе прыродаапісальная тэкставая частка, якая стварае ўражанне пракаветнай прыгажосці і загадкавасці родных мясцін.

Па-мастацку ўвасобіў Цішка Гартны вобраз роднага мястэчка і ў вершы пазнейшага часу з гэткай жа назвай «Капыль» (1927), які ўвайшоў у нізку «Чырвоная Случчына». Твору ў паэтычнай нізцы папярэднічае верш «Слуцк» (1925). Нягледзячы на яскрава выяўленыя ўрбаністычныя матывы, аўтарская візія, і гэта адразу заўважаецца, нясе ідэалагічны адбітак. У аснове канцэпцыі горада ляжыць ідэя падзелу, размежавання паводле прынцыпу «старое/былое – новае/савецкае». Гэтая бінарная апазіцыя, ці антыномія, тлумачыцца акалічнасцямі біяграфіі і светапогляду Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча), які ўспрыняў ідэі бальшавікоў-камуністаў, быў стваральнікам БССР, стаў па сутнасці першым пралетарскім паэтам. Пачатак верша «Капыль» з пункту гледжання сучаснага чытача шматабяцальны:

*З сівых вякоў выглядае даўнасць:*
*Замчышча, роў, курганы…*
*Ў казках-байках туманная слаўнасць*
*Дзеяў яго старыны…* [5, с. 101].

Пейзажна-гістарычная падсветка служыць фонам для стварэння карціны сацыяльнай няроўнасці і нядолі, якую напоўніцу зведаў працоўны люд. Князь, уладар замка, выступае як жорсткі эксплуататар, а сяляне – яго ахвяры. Аўтар дэманізуе локус замчышча: «…замчышча князя-пана – // Гэта быў страшны куток!» [5, с. 101]. Герой верша нагадвае князя-прыгнятальніка з паэмы «Курган» Янкі Купалы. Калі кіравацца трактоўкай урбаністычнай паэзіі савецкага часу паводле «Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў» пад рэдакцыяй Л. Цімафеева і С. Тураева, то можна канстатаваць: Цішка Гартны паказвае былы Капыль «з кантрастамі раскошы і беднасці» [9, с. 428]. Паэт завастрае праблему трагічнага падзелу Беларусі паводле Рыжскай дамовы 1921 г. на ўсходнюю і заходнюю часткі. Непадалёк ад Капыля прайшла мяжа, якая распалавініла беларускі край: «Помніць Капыль і, поўны трывогі, // Ўголас пытае: калі // Звяжуць суцэльна шляхі-дарогі // Часткі парванай зямлі? // Покуль жа будуць з гэтым гадзіцца // Родны Слонім, Нясвіж?» [5, с. 102]. Тут пераклічка астыёнімаў нібы звязвае ў адзінае цэлае беларускую прастору. У асобных вершаваных радках яскрава выяўляецца аўтарская вобразная экспрэсія: «Мые-мые граніцу рэчка Мажа. // Рэжа, як грунт капачы..» [5, с. 103]. Верш «Капыль»

засведчыў пра эклектыку ўрбанізаванага мыслення паэта, наяўнасць у ім сацыяльнай дамінанты, палітычнага чынніка.

Асаблівай увагі заслугоўваюць творы з паэтычнага цыкла Цішкі Гартнага «Горад», якія былі надрукаваны ў часопісе «Полымя» (1924, № 2). Між іншым, у гэтым жа часопісе ў № 1 за 1924 г. змешчаны і цыкл вершаў «Горад» А. Александровіча. Верш «Адвячоркам» – адметны пейзаж вячэрняга горада. У абсалютнай большасці твораў Цішка Гартны з вялікай замілаванасцю апяваў традыцыйнае прыроднае ўлонне з яго нівамі, лугамі, сенажацямі, лясамі, тут жа ён з захапленнем, любаваннем сузірае гарадскія аб’екты і рэаліі, пераключае пры гэтым увагу з аднаго на іншае (пейзаж рухомы, зменлівы), перадае адбітак уласных уражанняў і ў выніку стварае ўрбаністычную вобразна-матыўную прастору верша: «шэрасць лёгкая над горадам»; «гудок фабрычны свіст зацяжны строма кіне»; «працоўных натаўп рэзва, шумна зашнуруе»; «драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы» [5, с. 94] і інш. Паэт імкнецца як да паэтычнага ўзнаўлення візуальных назіранняў, так і да перадачы слыхавых адчуванняў. Паэтыка гарадской прасторы ў вершы ўяўляе сабой сукупнасць аб’ектаў і дынамічны падзейны шэраг, яскрава выяўлены вечаровы каларыт (спалучэнне шэрага і светлага колераў, цені, сярэбраны прамень, акварэльная лёгкасць): «Настрэчу ж месяцу блядному й зорак кучы // Агні электрыкі вакол з акон, з ліхтарань // Паднімуць ўверх прамень сярэбраны, бліскучы, // І зыкі выцісне дзяўчына на гітары…»; «Люблю сачыць, як дзень над горадам канае, // Лятучы ціха к небу дымам лёгкім, сівым!» [5, с. 94, 95]. Урбаністычны верш «Адвячоркам» мае рысы імпрэсіяністычнага жывапісу словам.

«Ноччу» – пейзажная замалёўка горада, у якой адлюстраваліся суб’ектыўныя вобразна-паэтычныя ўражанні. Гарадскі свет успрымаецца аўтарам як штосьці таямніча-загадкавае. Урбаністычная выява прыкметна міфалагізаваная ў духу рамантызму і сімвалізму: «І тут і там, здалёк і ўблізку, // Як ў цёмным полі – воўка вочы, // Ў раскідзе доўгай гнутай нізі // Агні па гораду бліскочуць»; «Хто іх разліў, з якой патрэбы – // Пытаеш – мрыюць над дамамі, // Як свечкі тыя над трунамі // Ў цалуне чорным звісшым з неба?» [4, с. 27, 28]. Паэт, зачараваны начным горадам, раскрывае філасофска-экзістэнцыйны стан душы, імкнецца спасцігнуць нейкую таямніцу быцця.

У прадмове да «Збору твораў» Цішкі Гартнага ў 4 тамах даследчык С. Александровіч асобна адзначае цыкл вершаў паэта «Берлін» (1922) [1, с. 13]. Праўда, у аўтарскім зборніку «Урачыстасць» (1924) гэты цыкл мае назву «Сучасны Берлін». Раней верш «З надворку», з якога пачынаецца цыкл, разглядаўся ў кантэксце так званай інтэрнацыянальнай тэмы. Напэўна, яго можна залічыць і да падарожных вершаў, экзатычнай тэмы, краіназнаўчай паэзіі. Аналіз тэматычнага зместу, вобразнай структуры верша «З надворку» дазваляе аднесці яго да ўрбаністычнай паэзіі. Трэба

сказаць, што Цішка Гартны здзейсніў падарожжа ў Германію, пра якое распавёў у нарысе «Ад Берліну да Мінску» (1922), надрукаваным у газеце «Савецкая Беларусь» [3]. У вершы «З надворку» паэт стварыў яркую прасторава-вобразную карціну Берліна:

*На мерку зроўненых муроў*
*Ўстаюць крутыя рэбры дахаў,*
*Іх вежы лёгкія, як птахі,*
*Ўздымаюць лес сваіх галоў.*
*Для стыкаў вуліц, ля пляцоў*
*Сягаюць к небу кірхаў шпіцы,*
*Ў прастор паветра, ў бляск зарніцы*
*Нясуць шум грэшных гарадоў.*
*Уверх, уверх! Бо душны дол*
*Ў разрэзах цесных, вузкіх вуліц*
*Жыццё раз'юшанае туліць*
*Каменнай цяжкасцю вакол* [6, с. 48].

Урбаністычны пейзаж фарміруюць такія локусы, як муры, дахі, камяніцы, гмахі, вуліцы, кірхі. Вобраз горада паўстае ў сваёй велічы, з шумнымі вуліцамі, шэрымі сценамі дамоў, чадным дымам. На ўспрыманне паэта, «каменні… здавілі яго» [6, с. 48]. Гарадскому тлуму і цяжару існавання ў замкнёнай прасторы, пачуццю стомы супрацьпастаўляецца свет жыцця прыроды. У вершы гучыць матыў уцёкаў да прыроднага ўлоння, распаўсюджаны, дарэчы, у паэзіі рамантыкаў: «…Нібы кудысь ўцячы мяркуе – // Прасторам, волей падыхаць»; «І, здэцца, вось агромны рух // Між шэрых сцен дамоў-грамадаў… паімчыцца // Ў зялёны луг, на рунь палёў» [6, с. 48, 49]. У вершы «Унутры» Цішка Гартны паказвае буржуазны, капіталістычны горад як свет сацыяльных кантрастаў і супярэчнасцей. Разам з тым у гэтым і іншых творах з цыкла «Сучасны Берлін» ён змог перадаць свае паэтычныя ўражанні ад сустрэчы з урбаністычнай экзотыкай:

*Ідзеш ты ім, глядзіш наўкруг –*
*Сляпіць багацце твае вочы.*
*У час спачынку, ў час рабочы –*
*Людзей лядачых гулкі рух.*
*Ядвабы, золата і пух,*
*Мяхі, маноклі, дыяменты…*
*Пакроі вопратак к мамэнту,*
*Кафэ, салонныя акцэнты –*
*Давольства збытачнага рух…* [6, с. 50].

Цішка Гартны быў адным з першых беларускіх паэтаў, які трапіў у Берлін, – буйны горад з вялікім насельніцтвам, цэнтр эканамічнага і палітычнага жыцця Заходняй Еўропы, тагачасны асяродак заможнасці і

багацця, з аднаго боку, і, з другога, – беднасці, нястачы сацыяльных нізоў, бяспраўнага становішча працоўнага люду. Паэт не хаваў негатыўнага стаўлення да буржуазнай рэчаіснасці. Берлін выклікаў у яго захапленне як індустрыяльны «горад-волат у каменным закуцці» [5, с. 90], горад працоўных, для якіх, на яго думку, хутка надыдзе «час другі, час зусім інакшы» [5, с. 90] (верш «У зялёным лесе»). Нягледзячы на сацыяльна-крытычны пафас, Цішка Гартны пашыраў культурную геаграфію, паэтычна абжываў прастору замежнага горада, засведчыў сваю духоўную і эстэтычную прысутнасць у ёй як назіральны і ўражлівы мастак слова.

Напрыканцы трэба дадаць, што, пачынаючы з гадоў юнацтва і на працягу жыцця, Цішка Гартны сваёй дзейнасцю і лёсам быў спалучаны з многімі гарадамі не толькі Беларусі, але і Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі. Горад, можна сказаць, гартаваў і фарміраваў яго як асобу, стаў месцам яго штодзённага быцця. Урбаністычная тапанімія ўвайшла ў яго свядомасць, біяграфію і творчасць. Урбанізм як спосаб мыслення не быў для Цішкі Гартнага чымсьці выпадковым, гэта з’ява бачыцца ментальна блізкай пісьменніку, які адметна ўвасобіў тэму і паэтыку горада.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Александровіч С.* Цішка Гартны // Гартны Ц. Збор твораў : у 4 т. Мінск : Маст. літ., 1987. Т. 1 : Вершы, 1909–1935; Апавяданні, 1909–1927. С. 6–26.
2. *Бельскі А.* «О, горада чароўныя прынады!» : станаўленне ўрбаністычнага мыслення ў беларускай паэзіі // Роднае слова. 2015. № 1. С. 3–6; № 3. С. 17–20.
3. *Гартны Ц.* Ад Берліну да Мінску : (з цягніка) // Сав. Беларусь. 1922. 3, 9, 14–17, 20 вер., 4 кастр.
4. *Гартны Ц.* З цыклю «Горад» // Полымя. 1924. № 2 (10). С. 27–28.
5. *Гартны Ц.* Збор твораў : у 4 т. Мінск : Маст. літ., 1987. Т. 1 : Вершы, 1909–1935; Апавяданні, 1909–1927. 438 с.
6. *Гартны Ц.* Урачыстасць. Менск : Дзяржвыд. Беларусі, 1925. 101 с.
7. Литературная энциклопедия : в 11 т. / редкол.: П. И. Лебедев-Полянский, И. М. Нусинов; гл. ред. А. В. Луначарский. М. : Худож. лит., 1939. Т. 11. 824 стлб.
8. *Рагойша В. П.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд., дапрац. і дап. Мінск : Беларус. навука, 2004. 576 с.
9. Словарь литературоведческих терминов / ред.-сост. Л. И. Тимофеев и С. В. Тураев. М. : Просвещение, 1974. 509 с.
10. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1987. Т. 5. 703 с.